# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 11 клас

## Варыянт 2

**Заданне 1.** Запішыце выказванні беларускіх мастакоў слова ў фанетычнай транскрыпцыі.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6.***

Мы вартыя не тым, хто больш сабе нагроб, а тым – хто больш аддаў па-людску людзям. (А. Бачыла.)

[______________________________________________________________

______________________________________________________________]

**Заданне 2.** Ніжэй змешчаны спіс сучасных запазычаных слоў, якія актыўна ўжываюцца ў беларускай мове. Для кожнага з іх трэба:

1. Даць кароткае тлумачэнне значэння.
2. Прапанаваць адзін ці два беларускія адпаведнікі (неалагізмы), якія маглі б выкарыстоўвацца замест запазычання.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6.***



*Стартап*




*Хэдлайнер*



*Білборд*

**Заданне 3.** Падбярыце да змешчаных у левым слупку назоўнікаў патрэбныя словы з наступнага абзаца так, каб склаліся фразеалагізмы. Для гэтага як самім апорным назоўнікам, так і падабраным словам пры неабходнасці надайце патрэбную граматычную форму. Запішыце атрыманыя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *аж*, *біць*, *гнуцца*, *з*, *зводзіць*, *з'есці*, *наплакаць*, *разводзіць*, *у*, *як*.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6.***

| | | |
|---|---|---|
| *вантроба* | ‘замучыць, загубіць нападкамі, ганеннем’ | |
| *кот* | ‘вельмі мала; пра нязначную колькасць каго-, чаго-н.’ | |
| *нос* | ‘з вялікім апетытам і прагна (есці)’ | |
| *рахунак* | ‘помсціць каму-н., расквітвацца з кім-н.’ | |
| *рука* | ‘даходзіць да крайняга здзіўлення, недаўмення; не ведаць, як выйсці з цяжкага становішча’ | |
| *хамут* | ‘рашуча не пагаджацца, упарціцца’ | |

**Заданне 4.** Ад прапанаваных слоў утварыце суфіксальным спосабам шэсць назоўнікаў, якія абазначаюць асобу чалавека (не больш за адзін ад кожнага зыходнага слова). У якасці ўтваральных выкарыстоўвайце толькі тыя словы, ад асноў якіх назвы асобы могуць быць утвораны непасрэдна.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| *разьба* | | *рэпрэзентаваць* | |
| *Коста-Рыка* | | *пляткарыць* | |
| *стварэнне* | | *алгебра* | |
| *Зімбабвэ* | | *інтэлект* | |
| *бег* | | *рэзаць* | |

**Заданне 5.** На аснове прапанаваных слоў запоўніце табліцу, выпісаўшы ў правы слупок слова (словаформу) адпаведна пазначаным у левым слупку патрабаванням.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| | | |
|---|---|---|
| 1 | ***Назоўнік ніякага роду:***<br>журы, Нарач, Гобі, прамяні | |
| 2 | ***Прыметнік, які мае нулявы суфікс:***<br>падталы, чорнабароды, яркі, матчын | |
| 3 | ***Займеннік, у якога корань складаецца з аднаго гука:***<br>вамі, табой, яна, нешта | |
| 4 | ***Складаны лічэбнік:***<br>абедзве, дваццаты, сямнаццаць, паўтара | |
| 5 | ***Дзеяслоў, у якім канчатак 1-й асобы адзіночнага ліку складаецца з аднаго зычнага гука:***<br>сыпаць, веяць, выдаць, пераядаць | |
| 6 | ***Дзеепрыслоўе, утворанае ад дзеяслова II спражэння:***<br>купаючыся, абуўшыся, крычучы, размяркоўваючы | |

**Заданне 6.** Пры электронным перакладзе з рускай мовы на беларускую ў некаторых сказах былі дапушчаны маўленчыя памылкі. Дапамажыце іх выявіць, патлумачыць і паправіць. Улічыце, што сярод прапанаваных могуць быць як сказы з памылкамі, так і без памылак.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| № сказа | Сказ |
|---|---|
| 1 | Іван Іванавіч Насовіч лічыцца зоркай першай велічыні не толькі ў гісторыі беларускай філалогіі, але і этнаграфіі. |
| 2 | Плошча Перамогі і велічны абеліск на ёй ужо даўно сталі адной з візітных картак горада Мінска. Чатыры бронзавыя вянкі вакол помніка сімвалізуюць чатыры франты, што вызвалялі Беларусь ад фашысцкіх захопнікаў. |
| 3 | Беларусы ганарацца і паважаюць свае дзяржаўныя сімвалы. |
| 4 | Род Вайніловічаў – адзін са старажытнейшых шляхецкіх родаў Беларусі. |
| 5 | Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр “Зубраня” расчыніла свае дзверы ў 1969 годзе. |
| 6 | Па выніках праведзенага апытання крытыкамі, найлепшай беларускай кінастужкай лічыцца мастацкі фільм рэжысёра Віктара Турава “Я родам з дзяцінства”. |

| № сказа | Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт сказа |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | | |
| 5 | | |
| 6 | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Когда потянулись, в более широких местах, осоковые и тростниковые заросли, Ассоль совсем было потеряла из вида алое сверкание парусов, но, обежав излучину течения, снова увидела их, степенно и неуклонно плывущих прочь. Раз она оглянулась, и лесная громада с ее пестротой, переходящей от дымных столбов света в листве к темным расселинам дремучего сумрака, глубоко поразила девочку. На мгновение оробев, она вспомнила вновь о кораблике и побежала изо всех сил. *(По А. Грину.)*

---

**Заданне 8.** Вы складаеце анталогію беларускіх лірычных твораў, напісаных цвёрдымі формамі. Кожны раздзел анталогіі прысвечаны адной канкрэтнай форме (напрыклад, санет, акраверш, актава, трыялет, рубаі і г.д.).

Ваш аднакласнік прапануе ў раздзел “Санеты” ўключыць верш Анатоля Грачанікава “На ўсім – адбітак сонца і вясны…”.

Ваша заданне:

1. **Праверце, ці з’яўляецца гэты верш санетам.** Правядзіце аналіз, звяртаючы ўвагу на абавязковыя прыкметы гэтай цвёрдай формы.
2. **Прыміце рашэнне і абгрунтуйце яго.**
   - ✓ **Калі згодны** з прапановай аднакласніка, прывядзіце **2 істотныя аргументы**, якія даказваюць, што верш адпавядае канонам санета.
   - ✓ **Калі не згодны**, прывядзіце **2 істотныя аргументы**, чаму верш нельга лічыць санетам. У гэтым выпадку вырашыце: **Ці ўключыце вы гэты верш у анталогію?** Калі так, то ў **раздзел** з якой цвёрдай формай Вы яго змесціце? Дакажыце, што верш адпавядае патрабаванням менавіта гэтага раздзела.

*Максімальная колькасць балаў –* ***5.***

***

*На ўсім – адбітак сонца і вясны.*
*У закаханых прыгажэюць твары.*
*Шчаслівы, хто багаты без казны,*
*Каго не абышлі кахання чары.*
*Шануйце гэту крохкасць навізны,*
*Няхай бурчаць няўдачнікі і скнары,*
*Аматары дакучлівых натацый,*
*Ахвяры ўсіх уласных імітацый.*

| ***Я <u>ўключаю</u> верш у раздзел “Санеты”*** |
|---|
| ***Мае аргументы “за”:***<br>**1.** ______<br>**2.** ______ |

| ***Я <u>не ўключаю</u> верш у раздзел “Санеты”*** |
|---|
| ***Мае аргументы “супраць”:***<br>**1.** ______<br>**2.** ______ |
| ***Я***<br>☐ ***не буду ўключаць верш у зборнік, бо гэта не ўзор цвёрдай формы***<br>☐ ***буду ўключаць верш у зборнік у раздзел “______”***<br>*(пастаўце знак “ ✓” насупраць правільнага адказу, калі выбіраеце другі варыянт, то дапішыце назву раздзела)* |
| ***Мае аргументы за ўключэнне гэтага верша ў раздзел “______”:***<br>**1.** ______<br>**2.** ______ |

**Заданне 9.** Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі мастацкіх твораў і іх пачаткамі. Неабходныя лічбы запішыце ў ячэйках побач з адпаведнымі літарамі. У наступнай ячэйцы запішыце аўтара гэтага твора.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| А | “Пошукі будучыні” | В | “Чорны замак Альшанскі” | Д | “Memento mori” |
| Б | “Незагойная рана” | Г | “Сэрца на далоні” | Е | “Дуб-дзядуля” |

| | |
|---|---|
| 1 | Доктар Яраш стаяў на даху веранды і свістаў, залажыўшы пальцы ў рот. Свістаў так, што здавалася, з дубоў пасыплецца лісце. У блакітнай бездані неба ўзнімалася чарада чаграшоў. Галубы кружылі над дачай. У “мікалаеўскіх чырвоных” гарэлі крылы. Раптам чараду быццам знесла ветрам: міг – і яна апынулася далёка над борам. І доктар ледзь не паляцеў следам за ёю. |
| 2 | Той дзень быў ціхі, хмурны, сухі і цёплы. Стаяў верасень месяц. І даўно гэта было. Час быў такі, што нашы бацькі былі на вайне. Ішла вайна з немцамі 1914–1918 гадоў. Усе мы былі або малыя, або самыя зялёныя падросткі. Асенні дзень ужо хіліўся да вечара свайго. Мы былі ў полі. Тыя гады прымусілі нас змалку дзён прывучвацца да плуга і касы, да пілы і сякеры, да гэбля і долата, да молата і кавадла. |
| 3 | З чаго мне, чорт пабірай, пачаць?<br>З таго прадвесня, калі за акном было сутонне і мокры снег?<br>А што вам да леташняга снегу й сутоння?<br>Пачаць з таго, хто я такі?<br>А што вам, урэшце, да мяне, звычайнага чалавека ў вялізным горадзе? І нашто вам мая самахарактарыстыка?<br>Адразу браць быка за рогі і расказваць?<br>А якое я маю права на вашу ўвагу? Тое права, што вы заплацілі грошы? Дык мала за якія паршывыя гісторыі людзі плацяць тыя грошы. |
| 4 | Амаль не ўся вёска зайздросціла мне майго надзела. Шнур быў, праўду кажучы, ані большы, ані выгаднейшы, ані зямліца на ім не лепшая, – можа нават горшая, бо пры канцы шнура была страшэнная гара, дзе апроч грэчкі ды ярыцы нічога не радзіла, але на самым версе гэтай гары рос такі дуб, што аж дзівіўся народ: веліч, таўшчыня, а сукі так разрасліся, што, здавалася, свет бы пад сябе хацеў падгарнуць. |
| 5 | Буяе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку. Гарэзным свавольнікам выскаквае ён з-за вуглоў на цесны панадворак, цярэбіць саламяную страху хлеўчука, нібы дурэючы, тузае па Тэклінай спіне блытаныя махры яе хусткі. Ад ветру і холаду ў старой макрэюць запалыя вочы, яна раз-пораз выпростваецца і, прыставіўшы да чурбана выслізганае тапарышча, ражком хусткі выцірае слёзы. |

| | |
|---|---|
| **6** | Час і людзі не шмат чаго пакінулі ад колішняй хутарской сядзібы, рэшткі якой спакваля праглынула зямля і развеяў вецер. Дзе-нідзе толькі выглядвалі на паверхню яе скупыя адзнакі: вуглавы камень падмурка, прытаптаны бугор бітай цэглы ды дзве гранітныя прыступкі каля былога ўвахода ў сені. Прыдарожныя гэтыя камяні ляжалі на тым самым месцы, што і сто год назад, і дробныя рудыя мурашы, якія недзе паблізу аблюбавалі сабе прыстанішча, дзелавіта снавалі па ніжняй прыступцы. Алешнік з рова, адхапіўшы добрую частку хутарскога поля, падступіў да самай сядзібы, на месцы істопкі па-царску разросся густы куст шыпшыны сярод буйных зараснікаў дзядоўніку, крапівы і маліннiку. |
| **7** | Позняй восенню сорак трэцяга года на адным з самых спакойных перагонаў Беларускай чыгункі ўзарваўся нямецкі вайсковы эшалон.<br>Праз дзень, халодным, золкім досвіткам, бліжэйшую да месца катастрофы вёску акружылі карнікі. Жандары ў касках і стракатых плашч-палатках і мясцовыя здраднікі-паліцаі ў чорных, прамоклых шынялях прыехалі з райцэнтра на пяці машынах. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **А** | | | **Г** | | |
| **Б** | | | **Д** | | |
| **В** | | | **Е** | | |

**Заданне 10.** Вы рыхтуеце асобнае выданне аднаго з найбольш вядомых твораў класіка беларускай літаратуры. Аўтара звалі Іван, але ва ўсім свеце яго ведаюць пад псеўданімам, узятым ад назвы народнага свята. У творы, які выдаецца, ідзе гаворка пра смелага і неверагодна дужага юнака, які страціў каханне і спакой. З крыўды яго сэрца стала цёмным, і шлях завёў у лясны гушчар, дзе ён трагічна загінуў. Пасля яго смерці людзі насыпалі курган, што захоўвае горкую легенду.

Пра які твор ідзе гутарка? **Запішыце назву твора і яго аўтара** (сапраўднае імя і псеўданім).

У кнізе плануецца раздзел з ілюстрацыямі. Уважліва вывучыце прапанаваныя малюнкі і **выберыце толькі два, што дакладна адлюстроўваюць сцэны з гэтага твора**.

**Напішыце кароткую прэамбулу (да 150 слоў) да гэтага раздзела**. Адзначце ключавыя эпізоды, перададзеныя мастакамі, і дайце кароткую ацэнку, наколькі ім удалося перадаць аўтарскую задуму, аргументуйце свае высновы. **Прыдумайце крэатыўны загаловак для вашай прэамбулы.**

*Максімальная колькасць балаў – **7**.*

| | |
|---|---|
| **Сапраўднае імя аўтара** | |
| **Самы вядомы псеўданім** | |
| **Назва твора** | |

**У асобны раздзел трэба ўключыць ілюстрацыі пад нумарамі ____________**

***Тэкст прэамбулы***

___________________________________________________________________________

1



*Мастак Арлен Кашкурэвіч*

2



*Мастак Арлен Кашкурэвіч*

3



*Мастак Васіль Басалыга*

4



*Мастак Міхаіл Басалыга*

5



*Мастак Васіль Шаранговіч*

6



*Мастак Барыс Забораў*